**Ф.М.Гуліцкі,** *магістрант*

# МУЗЕІ ЯК ЦЭНТРЫ САМАПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

Агульнавядома, што музеі маюць надзвычай вялікі навукова-пазнавальны патэнцыял [1], але ён, на наш погляд, выкарыстоўваецца недастаткова ў вучэбнай працы кафедраў, у падрыхтоўцы спецыялістаў. У лепшым выпадку музей успрымаецца як аб'ект разавага наведвання, візуальнага азнаямлення. Думаецца, кафедры павінны больш цесна супрацоўнічаць з адпаведнымі музеямі, пры якіх варта было б стварыць студэнцкія даследчыя лабараторыі для выпускнікоў, бакалаўраў, магістраў, дзе яны рыхтавалі б курсавыя даследаванні, рэфераты, дыпломныя работы. Тут студэнты адчулі б сябе сапраўднымі даследчыкамі, паглыбілі б свае тэарэтычныя веды, удасканалілі б метадалагічныя навыкі і прыёмы, увялі б у навуковы зварот музейныя фонды з запаснікаў і актыўна іх прапагандавалі б сярод насельніцтва.

Варта было б прыгледзецца і, магчыма, вывучыць і пашырыць вопыт музея-лабараторыі імя Ф.Скарыны пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Гэты музей створаны па ініцыятыве і пры штодзённай падтрымцы акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Б.В.Бокуця, фізіка, выдатнага знаўцы беларускай гісторыі і культуры. Музей-лабараторыя Ф.Скарыны мае больш за паўтысячы адзінак асноўнага фонду, сярод якіх выданні Нясвіжскай друкарні, матэрыялы пра Кірылу Тураўскага, Міколу Гусоўскага, Сімяона Полацкага і ў першую чаргу пра Ф.Скарыну. Тут знаходзяцца палотны жывапісцаў і графікаў, скульптуры, прысвечаныя беларускаму вучонаму і першадрукару. У музеі створана інфармацыйна-бібліяграфічная картатэка "Усё пра Скарыну", выдадзены тры зборнікі-хрэстаматыі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Як сцвярджае загадчык музея К.Усовіч, тут выкладчыкі рэгулярна праводзяць семінары, факультатыўныя заняткі. Кафедры арганізоўваюць на базе музея навуковыя канферэнцыі, Скарынаўскія чытанні, а студэнты пішуць на яго матэрыялах свае навуковыя даследаванні. Менавіта такім шляхам ідзе ў навуку таленавітая моладзь, у выніку гуманітарныя кафедры не адчуваюць недахопу дыпламаваных спецыялістаў.

У Мінску ёсць унікальныя магчымасці для выкарыстання матэрыялаў музея ў вучэбных і навуковых мэтах. Тут працуюць музеі народных пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча [2], Петруся Броўкі; у розных мясцінах ёсць іх філіялы: у Мікалаеўшчыне Стаўбцоўскага раёна, у Вязынцы і Ракуцёўшчыне Маладзечанскага раёна, у Ляўках пад Оршай, у Вяззі Асіповіцкага раёна, у Гродне і інш. Звычайна ў месцах нараджэння пісьменнікаў функцыянуюць народныя, школьныя музеі, у прыватнасці ў Журавічах Рагачоўскага раёна — музей драматурга Андрэя Макаёнка [3], у Глінішчах Хойніцкага раёна — Івана Мележа, на Смаргоншчыне — пачынальніка сучаснай беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча [4], у Оршы нядаўна адчынены музей Уладзіміра Караткевіча; шмат гадоў функцыянуе ў Цімкавічах Капыльскага раёна музей Кузьмы Чорнага. Асобным пісьменнікам прысвечаны экспазіцыі ў абласных і раённых краязнаўчых музеях.

Калі да гэтых музеяў "прыпісаць" студэнтаў спецыялізацыі "бібліятэказнаўства, бібліяграфія і беларуская мова і літаратура", то моваведы вывучылі б ці нават даследавалі, як вышуквалася найбольш дакладнае слова, як шліфавалася думка, як падбіраліся мастацка-вобразныя сродкі; студэнты-літаратары дазналіся б, як "выспявалі" сюжэт, кампазіцыя, як ствараўся вобраз, ці былі яго прататыпы; гісторыкі супаставілі б, як адлюстравалася эпоха ў навуковых даследаваннях і мастацкіх творах і інш.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Вялікае поле пошукаў і даследаванняў ёсць у Мінску і для мастакоў. Нагадаем пра мемарыяльныя музеі скульптараў Андрэя Бембеля, Аляксея Глебава, нядаўна адчынены — Заіра Азгура, Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, музеі ў Магілёве, Бялынічах і іншых гарадах. Думаецца, знайшлася б цікавая справа і для музыказнаўцаў, і для харэографаў. Маем на ўвазе Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі (з архівамі Г.Вагнера, Ю.Семянякі, К.Цесакова, І.Лучанка), Нацыянальны мастацкі музей Беларусі і яго філіял ў Раўбічах, Веткаўскі, Заслаўскі, Крошынскі музеі народнай творчасці (рамёстваў і народных промыслаў) і інш. Калі б выпускнікі універсітэта далучыліся да гэтай справы, то, напэўна, ініцыявалі б стварэнне музеяў патрыярхаў беларускай музыкі, народных артыстаў Рыгора Шырмы, Генадзя Цітовіча, Іосіфа Жыновіча, мастакоў Івана Хруцкага і іншых дзеячаў мастацтва і культуры. Гэтыя людзі сябе ўвекавечылі сваімі творамі, а нашчадкі абавязаны ўвекавечыць памяць пра іх не толькі сціплымі мемарыяльнымі дошкамі на дамах ці назвамі вуліц, школ, бібліятэк.

Вялікая роля ў адраджэнні нацыянальнай культуры належыць беларускаму скансэну, Беларускаму дзяржаўнаму музею народнага дойлідства і побыту [5]. Назва "скансэн" у перакладзе са шведскай мовы азначае *акоп*, а дачыненне яго да музея такое: у 1891 г. у Стакгольме пад кіраўніцтвам вучонага і педагога Артура Хацэліўса быў пабудаваны парк-музей на месцы, скапаным акопамі-скансэнамі. Таму музеі народнага дойлідства пад адкрытым небам і сталі называць скансэнамі. Цяпер іх у Еўропе некалькі соцень. Ідэя стварэння беларускага скансэна была выказана яшчэ напачатку XX ст. мастаком Фердынандам Рушчыцам, які добра ведаў асаблівасці нацыянальнай архітэктуры і ў творчай спадчыне якога збераглiся жывапісныя і графічныя палотны "Мінск зімою", "Крэва", "Багданава" (родная вёска на Валожыншчыне), "Млын

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ноччу", "Млын зімою" і інш. Рэалізацыя гэтай ідэі пачалася ў 1976 г. Пад музейны комплекс каля вярхоўя Воўчкавіцкага вадасховішча на рацэ Пціч, за 12 км ад Мінска, адведзена каля 180 га. Экспазіцыйная зона складаецца з сектараў, прысвечаных матэрыяльнай і мастацкай культуры такіх асноўных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, як Паазер'е, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе. Кожны рэгіён будзе прадстаўлены вёсачкай з 5—6 сядзіб, у якой будуць узноўлены тыповыя для рэгіёна інтэр'еры, побытавыя прадметы, гаспадарчае начынне, рамесніцкія майстэрні, культавыя збудаванні. Прадугледжваецца паказ рэгіянальных асаблівасцей земляробства, садоўніцтва, агародніцтва, лясной гаспадаркі. Творча апантаны калектыў музея экспедыцыйным шляхам выявіў больш за 200 помнікаў народнага драўлянага дойлідства, сабраў прыкладна 10 тыс. экспанатаў. Ужо адбудаваны і функцыянуюць сектары Цэнтральная Беларусь, Паазер'е і Падняпроўе [6].

Характарыстыка беларускага скансэна прыведзена для таго, каб, па-першае, паказаць, якія неабмежаваныя магчымасці ў студэнцкай моладзі для самастойнай працы і на карысць гэтай гістарычнай будоўлі, і на ўласную карысць з мэтай лепшага асваення сваёй спецыялізацыі, паглыблення прафесійных ведаў. Як сведчыць дырэктар гэтага музея, увагі, тым больш дапамогі ад вышэйшых навучальных устаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ад гуманітарных факультэтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, на жаль, няма. Сродкі на інтэнсіўнае будаўніцтва надзвычай сціплыя, час няўмольна ляціць, а шматлікія выяўленыя помнікі разбураюцца. Застаецца адно выйсце — аб'явіць Беларускі дзяржаўны музей народнага дойлідства і побыту ўсенароднай нацыянальнай будоўляй з прыцягненнем сродкаў мецэнатаў-спонсараў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Па-другое, з улікам апісанага становішча хочацца прывесці ўласныя назіранні за ўражаннямі групы палякаў, якія наведалі беларускі скансэн над Пціччу. Здзіўленню і захапленню гасцей не было межаў. Усё іх ўражвала, усё ўспрымалася як вялікая нацыянальная каштоўнасць. Здавалася: Беларусь і Польшча — краіны-суседкі, мы — народы-славяне, у нас шмат агульнага і падобнага, а ўсё ж мноства спецыфічнага, арыгінальнага і ў побыце, і ў вырабах, і ў простым сялянскім начынні, і ў рамёствах, і ў пабудовах. Усе заварожвала, зачароўвала гасцей, выклікала добрую зайздрасць. А нас, мясцовых, ахоплівала пачуццё гонару за тое, што маем, што намагаемся ў гэты цяжкі час яго зберагчы.

На памяць прыходзяць радкі з верша Ніла Гілевіча, які назіраў за рэакцыяй немца-філолага, загадчыка аддзялення славянскіх моў Берлінскага універсітэта імя братоў Гумбальтаў прафесара Карла Гутшміта ў ноч на Купалле над Гайнай на Лагойшчыне:

Ах, якая над Гайнай купальская ноч!
Раскладайце, паліце Купалля агні!
Ах, якое купаллейка ў вас!
Ах, якую вы спадчыну маеце!

Застаецца спадзявацца, што, як і плануецца, Беларускі дзяржаўны музей народнага дойлідства і побыту разам з Вязынкай, Заслаўем, Прылукамі ўвойдзе ў турыстычны маршрут "Старажытнае кальцо горада Мінска".

Наогул, музеі рэспублікі маглі б аказваць ВНУ розных профіляў вялікую навукова-метадычную падтрымку, і ў першую чаргу ў адукацыйнай сферы, прадастаўляючы сваю базу для навуковых даследаванняў. Прыгадаем, што музейная справа ў Беларусі з кожным годам паспяхова развіваецца. Пра гэта сведчаць такія факты: у пачатку 80-х гадоў у веданні Міністэрства культуры было 90 музеяў з 500 супрацоўнікамі, асноўныя фонды складалі 1,4 млн. адзінак. У 1998 г.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

функцыянавалі ўжо 150 музеяў разам з буйнымі філіяламі, у якіх звыш тысячы супрацоўнікаў, а музейныя фонды склалі каля 2,5 млн. адзінак. Зразумела, што дзяліцца сваімі скарбамі нікому не хочацца, таму ВНУ і музеі павінны на пэўных умовах заключыць адпаведныя партнёрскія пагадненні, а магчыма, і замацаваць такое супрацоўніцтва ў маштабе краіны заканадаўча.

Статус музеяў, па нашым меркаванні, у грамадстве павышаецца. Музеі цяпер, відаць, адзіныя ўстановы, не заражаныя бацыламі масавай культуры, папсы, якія разбураюць духоўны свет чалавека, скіроўваюць моладзь на ўспрыманне спрошчанай, прымітыўнай эрзац-культуры. У такіх умовах музеі становяцца сродкам абароны ад экспансіі замежнага і свайго нізкапробнага мастацтва і адначасова, узнаўляючы праўдзівую гісторыю грамадства, дапамагаюць пазбавіцца ад рэшткаў таталітарнай ідэалогіі ў свядомасці людзей. Стомленыя кінабаевікамі і серыяламі, рознымі шоу, крымінальнымі дасье, пахабным гумарам, людзі ўсё часцей наведваюць музеі, дзе знаходзяць супакаенне, эстэтычнае задавальненне, атрымліваюць псіхалагічную разгрузку. Радуе, што 75 % наведвальнікаў музеяў – дзеці, а засмучае тое, што з гадамі, у тым ліку і ў студэнцкую пару, маскультура пачынае выцясняць больш высокія маральныя і культурныя каштоўнасці. Як сведчыць сацыялагічнае апытанне, праведзенае ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, 49,5 % студэнтаў цікавіць сучасная эстрада, 39,9 % — дызайн бытавой тэхнікі і аўтамабіляў, 38,5 % — кіна- і відэапрадукцыя. Тэатрам захапляюцца 25,9 % апытаных студэнтаў, а гісторыяй роднага краю — толькі 23,8 % [7].

На сучасным этапе музей як сацыякультурны інстытут не можа заставацца толькі аб'ектам турыстычнага наведвання. Яго месца ў сістэме навукі, культуры, асветы стабільна акрэсленае і відавочнае. У сістэму адукацыі музей павінен уключыцца як яе найважнейшае звяно, як цэнтр абуджэння нацыянальнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

самасвядомасці, цэнтр самаідэнтыфікацыі нацыі. Гэтага можна дасягнуць за кошт супрацоўніцтва з пастаянным кантынгентам студэнтаў і моладзі ўвогуле, якія будуць наведваць выставы, лекторыі, удзельнічаць у канферэнцыях, сімпозіумах, прысутнічаць на прэзентацыях новых твораў (паступлення̌ў) ці на сустрэчах са знакамітымі дзеячамі культуры. І не толькі прысутнічаць у якасці статыстаў, але і рыхтаваць такія мерапрыемствы. У выніку супрацоўніцтва хутчэй праходзіла б адаптацыя маладога спецыяліста да прафесіі, да месца працы, лягчэй пераадольваліся б нясмеласць, замкнутасць, а музей меў бы выбар найлепшага маладога супрацоўніка; магчыма, хутчэй уводзіліся б у навуковы абарот і запасныя фонды. Думаецца, пры такім узаемадзеянні ніякая акадэмічная лекцыя, ніякія семінарскія заняткі нават з ілюстрацыяй альбомаў, рэпрадукцый, паштовак (калі яны толькі ёсць) не могуць канкурыраваць па аб'ёме інфармацыі, эстэтычным уздзеянні і псіхалагічным настроі з двух-, трохгадзінным наведваннем музея, дзе ўсё ў сістэме, усё кампактна, усё перад вачыма, а калі яшчэ з эрудзіраваным экскурсаводам, то душэўнае ўзрушэнне ахопіць кожнага, хто пераступіў парог храма муз.

Музей, на наш погляд, — гэта грунтоўная, але, на жаль, яшчэ малазапатрабаваная пляцоўка для самападрыхтоўкі спецыялістаў у сістэме мастацтва, культуры, адукацыі, а таксама цэнтр паслядыпломнага павышэння інтэлектуальнага ўзроўню як маладога спецыяліста, так і грамадства ў цэлым.

*1. Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі. — Мн., 1999. — Т.5.

*2. Бяляцкі А.* Музеі Максіма Багдановіча//Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1991. — №6. — С.64—65.

*3. Васючэнка П.* Музей Андрэя Макаёнка//Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1991. — №4. — С.79

*4. Кулагін А.* На радзіме Багушэвіча// Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1989. — №10. — С. 61—65.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*5. Титов В.С.* Историко-этнографические регионы в экспозиции Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта. — Мн., 1989.

*6. Барыс С.* Музей над Пціччу // Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1990. — №5. — С.79.

*7. Скікевіч А.А., Шчур У.С.* Аб сацыялагічным забеспячэнні культуралагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ // Чалавек, культура, экалогія: Матэрыялы міжнар. канф. —Мн., 1998. — С.77.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ